В. П. Красней

# Беларуская мова
# ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

## Лексічны разбор слова

| Парадак разбору | Узор разбору |
|---|---|
| 1. Лексічнае значэнне; аднaзначнае ці мнагазначнае; ужыта ў прамым ці ў пераносным значэнні; ці мае сінонімы, амонімы, антонімы.<br>2. Спрадвечна беларускае ці іншамоўнае (запазычанае).<br>3. Агульнаўжывальнае ці абмежаванага ўжывання (дыялектызм, тэрмін, прафесіяналізм).<br>4. Адносіцца да актыўнай ці пасіўнай лексікі.<br>5. Стылістычна нейтральнае ці стылістычна афарбаванае (кніжнае, размоўнае) | Дзяўчына папраўляе косы, што ў люстры возера відны (А. Пысін).<br>Люстра.<br>Лексічнае значэнне — ‘адшліфаваная паверхня шкла, што адлюстроўвае прадметы’; мнагазначнае; ужыта ў пераносным значэнні ‘гладкая паверхня вады’; мае амонім *люстра* — ‘падвясны асвятляльны прыбор’; іншамоўнае (з польск. м.); агульнаўжывальнае; адносіцца да актыўнай лексікі; стылістычна нейтральнае |

## Словаўтварэнне

**Словаўтварэнне** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаецца структура слоў і спосабы іх утварэння.

## Марфемная будова слова

**Марфема** — найменшая структурная частка слова, якая выражае пэўнае значэнне.

| Марфема | Марфема ў саставе слова | Функцыя марфемы |
|---|---|---|
| Корань | галоўная значымая частка слова:<br>школа, лес | выражае агульнае значэнне роднасных (аднакаранёвых) слоў:<br>школ-а, школь-ны, шкал-яр;<br>лес, уз-лес-ак, ляс-ны |
| Прыстаўка | знаходзіцца перад коранем ці другой прыстаўкай:<br>вы-кідаць, на-вы-кідаць | служыць для ўтварэння слоў ці граматычных формаў слова:<br>кідаць — выкідаць,<br>выкідаць — навыкідаць |



© ТДА «Аверсэв»

| Марфема | Марфема ў саставе слова | Функцыя марфемы |
| --- | --- | --- |
| Суфікс | знаходзіцца пасля кораня ці іншага суфікса: кут-ок, кут-оч-ак | служыць для ўтварэння слоў ці граматычных формаў слова: кут — куток, куток — куточак |
| Канчатак | зменная частка ў канцы слова: дрэв-а, дрэв-у, дрэв-ам, дрэв-ы, дрэв-амі | служыць для ўтварэння граматычных формаў слова і для сувязі слоў у словазлучэннях і сказах: дрэва, дрэву, дрэвам, вялікае дрэва, вялікаму дрэву |
| Постфікс | знаходзіцца пасля формаўтваральнага суфікса ці канчатка: хтосьці, мыцца | служыць для ўтварэння слоў і граматычных формаў слоў: хто → хтосьці, мыць → мыцца |
| Інтэрфікс | знаходзіцца паміж каранёвымі марфемамі: шэр-а-вокі, сад-а-вод | служыць для злучэння іх у складаным слове: шэрыя вочы → шэравокі, разводзіць сады → садавод |

## Аснова, віды асноў

**Аснова** — частка зменнага слова без канчатка ці ўсё нязменнае слова. У аснове слова заключаецца яго лексічнае значэнне.

**Віды асноў**

- **простая**: салом-а, рэзаць
- **складаная**: саламарэзка
- **невытворная** — складаецца толькі з каранёвай марфемы: вад-а, грыб
- **вытворная** — складаецца з кораня і іншых марфем: вадзян-ы, грыбн-ы
- **утваральная** — ад якой утворана іншае слова: зім-а → зім-ов-ы



© ТДА «Аверсэв»

# Мнагазначнасць, аманімічнасць і сінанімічнасць марфем

**Марфемы**

| мнагазначныя | аманімічныя | сінанімічныя |
|---|---|---|
| у межах адной часціны мовы выражаюць некалькі значэнняў: кедроўнік (прадмет), грыбнік (асоба) | аднолькава вымаўляюцца і пішуцца, але выражаюць рознае значэнне: гораду — іду, купаць — купіць | выражаюць аднолькавае ці блізкае значэнне: комік — будаўнік — стралок — грузчык — каваль — вучань — хітрун |

# Спосабы ўтварэння слоў

| Утваральная аснова ці слова | Словаўтваральная марфема | Вытворнае слова | Спосаб утварэння |
|---|---|---|---|
| грыб<br>вясёлы | -нік<br>-осць | грыбнік<br>весялосць | суфіксальны |
| радзіма<br>чытаць | пра-<br>пера- | прарадзіма<br>перачытаць | прыставачны (прэфіксальны) |
| голас<br>школа | па... -к- (а)<br>пры- ... -н- (ы) | пагалоска<br>прышкольны | прыставачна-суфіксальны |
| адрэзаць<br>авечка | ∅<br>∅ | адрэз∅<br>авеч∅(ы) — авечы | бяссуфіксны (нуль-суфіксальны) |
| сабраць<br>што | -ца<br>-небудзь | сабраца<br>што-небудзь | пост-фіксальны |



© ТДА «Аверсэв»

| Утваральная аснова ці слова | Словаўтваральная марфема | Вытворнае слова | Спосаб утварэння |
|---|---|---|---|
| вусы<br><br>ноч | бяз- ... -∅-(ы)<br><br>на- ... -∅ | бязвус∅(ы) — бязвусы<br>нанач∅ — нанач | прыставачна-нульсуфіксальны |
| бегчы<br>гаварыць<br>касіць | раз- ... -ся<br>на- ... -ца<br>ад- ... -ца | разбегчыся<br>нагаварыцца<br>адкасіцца | прыставачна-постфіксальны |
| колас<br>сіні | -і- + цца<br>-е- + цца | каласіцца<br>сінецца | суфіксальна-постфіксальны |
| жалеза і бетон<br>від краю | -а-<br>-я- | жалезабетон<br>краявід | асноваскладанне |
| мала ўрадлівы<br>зала кіно | | малаўрадлівы<br><br>кіназала | словаскладанне |
| зычыць дабро<br>лавіць мух | -а- ... -лів- (ы)<br>-а- ... -к- (а) | добразычлівы<br>мухалоўка | складана-суфіксальны |
| Беларуская энцыклапедыя<br>Вялікае Княства Літоўскае | Бел + эн (часткі базавых слоў)<br><br>В + К + Л (літары базавых слоў) | БелЭн<br><br>ВКЛ [вэкаэл] | абрэвіяцыя |
| люты (мароз)<br><br>Напярэдадне быў лес. | | месяц люты<br><br>Напярэдадне калоны ішоў запявала. | марфолага-сінтаксічны (пераход адной часціны мовы ў другую) |



© ТДА «Аверсэв»

## Словаўтваральны разбор слова

| Парадак разбору | Узор разбору |
|---|---|
| 1. Назваць слова ў пачатковай форме.<br>2. Вызначыць яго лексічнае значэнне.<br>3. Вызначыць, вытворнае ці невытворнае.<br>4. Параўнаць з аднакаранёвымі і выявіць тое слова, ад якога ўтворана дадзенае слова (г. зн. найбліжэйшае роднаснае).<br>5. Параўнаць аналізуемае слова з бліжэйшым роднасным і выявіць утваральную аснову.<br>6. Вызначыць словаўтваральны сродак (сродкі).<br>7. Назваць спосаб утварэння.<br>8. Графічны запіс | 1. Перапісчык.<br>2. Той, хто перапісвае што-небудзь.<br>3. Вытворнае слова.<br>4. Аднакаранёвыя словы: пісаць, напісаць, перапісаць, спісаць, спіс, пісьмо, пісьменны, перапісваць. Найбліжэйшыя роднасныя: перапісаць, перапісваць.<br>5. Перапісчык — перапісаць (перапісваць). Утваральная аснова — перапіс.<br>6. Утворана пры дапамозе суфікса -чык.<br>7. Спосаб утварэння — суфіксальны.<br>8. Перапісчык ← перапісваць |

## Марфемны разбор слова

| Парадак разбору | Узор разбору |
|---|---|
| 1. Назваць слова ў пачатковай форме.<br>2. Вызначыць лексічнае значэнне слова.<br>3. Вызначыць, зменнае ці нязменнае слова.<br>4. Выдзеліць канчатак і аснову.<br>5. Падабраць аднакаранёвыя словы.<br>6. Выдзеліць корань.<br>7. Выдзеліць пры наяўнасці суфікс (суфіксы), прыстаўку (прыстаўкі).<br>8. Зрабіць графічны запіс | 1. Перапісчык.<br>2. Той, хто займаецца перапісваннем чаго-небудзь.<br>3. Зменнае слова.<br>4. Канчатак — нулявы, аснова — перапісчык.<br>5. Пісаць, перапісаць, спісаць, перапісваць, напісаць, пісьмо.<br>6. Корань — -піс-.<br>7. Суфікс — -чык, прыстаўка — пера-.<br>8. Пера піс чык □ |



© ТДА «Аверсэв»